УДК 821.161.3

**Н. А. Яўсеева, Т. М. Пучынская**
*Установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт», Баранавічы, Рэспубліка Беларусь*

# ВОБРАЗЫ ВАДЗЯНІКА І РУСАЛКІ ЯК УВАСАБЛЕННЕ ВОДНАЙ СТЫХІІ Ў ТВОРАХ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

**Уводзіны.** Міфалагізацыя мастацкага мыслення пісьменнікаў сведчыць пра іх цікавасць да народнай культуры і традыцый. Універсальнай прыроднай стыхіяй з'яўляецца вада, мастацкі вобраз якой характарызуецца сімвалічнасцю і дваістасцю. Ён увасабляе чысціню, жыццё, бесперапыннасць яго руху і, разам з тым, небяспеку, непрадказальнасць. Таямнічасць воднай прасторы трансфармавалася ў народныя вераванні, звязаныя з міфа-лагічнымі істотамі — насельнікамі вадаёмаў. У дадзенай працы ўвага засяроджана на дынаміцы раскрыцця вобразаў вадзяніка і русалкі ў творах беларускай літаратуры.

**Асноўная частка.** Вадзянік, вадзяны цар — валадар усіх водных прастораў. У фальклоры гэта дух або ўвасабленне разбуральнай, варожай чалавеку стыхіі вады ў выглядзе міфічнага гаспадара канкрэтнага вадаёма [1, с. 59]. Вадзянік сімвалізуе дваістасць і трансфармацыю (чалавек з адзнакамі рыбы або жывёлы), увасабляе ідэю існавання паміж двума светамі або ідэнтычнасцямі. У народных уяўленнях сама водная прастора лічылася мяжой паміж «гэтым і тым светамі», месцам рассялення душ памерлых.

Адным з першых пісьменнікаў, хто звярнуўся да вобраза вадзяніка, з'яўляецца Я. Баршчэўскі. У яго баладзе «Зарослае возера» выкарыстаны народныя паданні, у якіх вадзянік увасабляе разбуральныя сілы: «Злы дух падслухаў нараду й размовы, // Што будуць клікаць плябана, // Выдумаў жарт яшчэ гэтакі новы, // Што толькі ў духу шайтана» [2, с. 76]. «Злы дух» варожа ставіцца да рыбакоў і, каб нашкодзіць ім, жартам перавозіць рыбу ў іншае месца. Дакладна перадаючы змест народных вераванняў, Я. Баршчэўскі паказвае, што вадзянік можа не толькі шкодзіць, але і спрыяць чалавеку. Так, гаспадар вады ў знак удзячнасці за карыстанне вазком пакінуў рыбаку шчупака: «Бачыць вазок свой, ён лёдам скаваны, // А на вазку — шчупачышча» [2, с. 77]. Пісьменнік выяўляе рысы язычніцкага і хрысціянскага светапогляду, спалучае іх у свядомасці герояў. Народ паклікаў ксёндза, каб той асвяціў возера, у якім жыве чорт: «Богу старанна пачаўшы маліцца, // Службу святую там справіў; // Высвянціў невад і тую вадзіцу, // Працу на добрасць уславіў» [2, с. 77].

Вобразы міфічных насельнікаў вады Я. Баршчэўскі выкарыстаў і ў празаічным зборніку «Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях». Змест гісторыі «Рыбак Родзька» склалі два паданні: пра Зарослае возера (паводле яго асобна напісана балада) і Глухое возера. Пісьменнік звязвае наяўнасць злых духаў з праблемай унутранага стану чалавека, які аддаляецца ад Бога, жыве непачцівасцю да яго: «Раскажу пану, як у нашых краях праз чары і праз шкодлівых людзей распладзіліся злыя духі. // Ці ж злыя духі, — сказаў я, — могуць пладзіцца, як звяры? // Могуць, бо людская злосць ім — найлепшая паша» [2, с. 145]. Вялікая колькасць і разна-стайнасць чарцянят, якіх рыбакі выцягнулі нератам з Глухога возера, наводзіць жах: «Былі там нячысцікі накшталт ракаў з чорнаю поўсцю, іншыя — як павукі, кожны з ката, іншыя падобныя да шчанюкоў, з нагамі незвычайнае даўжыні. Нельга апісаць усё гэтае страхоцце» [2, с. 150]. Абагульнены вобраз «маленькіх д'яблікаў» успрымаецца як псіхалагічны паралелізм: шматлікія негатыўныя з'явы чалавечага жыцця суадносяцца са звышнатуральнымі цёмнымі сіламі прыроды. Пан сабраў злачынцаў з розных канцоў свету, таму і злых духаў стала так шмат: «У тых дзікіх лясах ля Глухога возера было шмат злачынцаў. …І не мелі яны ў сэрцы ні веры, ні Бога, ані любові да бліжняга. Доўга хаваліся яны каля гэтага возера, а таму і д'ябал там пасяліўся» [2, с. 151].

Вадзянік увасабляе магутнасць прыроднай стыхіі, у супрацьстаянні з гэтым міфічным персанажам чалавек звычайна прайграе. Героі Я. Баршчэўскага імкнуцца пазбягаць сустрэчы з гаспадаром вады, таму прастора, дзе жыве вадзяны цар, застаецца некранутай чалавекам: «З таго часу ніводзін рыбак не закідаў сеці на гэтым возеры. Знядбанае людзьмі, зарасло яно ўсё багавіннем, пакрылася навекі зялёным імхом…» [2, с. 149]. Такім чынам, вадзянік увасабляе не толькі разбуральныя сілы, ён засцерагае прыродную прастору ад празмернай актыўнасці чалавека, ахоўвае яе. У тым выпадку, калі людзі не парушаюць законы прыроды, вадзянік становіцца іх заступнікам ад няшчасцяў на рэках і азёрах.

Міфалагічныя персанажы, іх знешні выгляд, лад жыцця выяўляюць менталітэт, культуру, быт канкрэтнага народа. Гэтая асаблівасць фальклору адлюстравана і ў мастацкай літаратуры. Так, вадзянік, герой аднайменнага верша М. Багдановіча, нагадвае беларуса сталага веку: «Сівавусы, згорблены, я залег між цінай // І гадамі грэюся — сплю на дне ракі. // Твар травой аблутана, бытцам павуцінай, // Засыпаюць грудзі мне жоўтые пяскі» [3, с. 47]. Месца жыхарства вадзяніка ў творы М. Багдановіча ўяўляе сабой тыповы беларускі краявід: «Над вадой ля берага ціха спіць асока, // Ды лаза зялёная жаліцца-шуміць, // Хвалі ціха коцяцца і бягуць далёка, — // І усё навокала сном адвечным спіць» [3, с. 47]. Заняткі вадзяніка, лад яго жыцця таксама блізкія да народнага. Так, у казцы У. Караткевіча «Чортаў скарб», гаспадар вады, як звычайны селянін, пасвіць «шчупакоў, лінёў ды акунёў» [4, с. 472].

Матыў воднай стыхіі як таямнічай прасторы, населенай міфічнымі істотамі, прысутнічае і ў іншых творах У. Караткевіча. У аповесці «Дзікае паляванне караля Стаха» містыцызм узмацняецца, дзякуючы апісанню глухіх мясцін, дзе валадарыць вадзянік: «Глуха і бязлюдна было тут… Вада ручаіны несла сумныя



Рэпазіторый БарДУ

жоўтыя і чырвоныя чоўнікі лісцяў, а ў адным месцы, дзе быў вір, лісце круцілася ў вечным танцы, быццам там вадзянік варыў з яго суп на вячэру» [5, с. 283].

Вобраз вадзяніка ў класічнай літаратуры выкарыстоўваецца пісьменнікамі для фальклорнай стылізацыі твораў. Матывы, звязаныя з гэтым персанажам, хоць і маюць аўтарскае ўвасабленне, аднак шмат у чым паўтараюць змест павер'еў, легенд, паданняў.

У сучаснай літаратуры вобраз вадзяніка не страціў сваёй папулярнасці і набыў адметнае гучанне. Выяўленне гэтага міфічнага персанажа, як правіла, звязваецца з раскрыццём тэмы беражлівых адносін да навакольнага свету. Вадзянік становіцца сімвалам некранутай прыроды, прастора якой сёння ўсё больш звужаецца. Героі сучасных кніг не толькі не адчуваюць страх перад гаспадаром вады, яны з жалем адзначаюць яго адсутнасць у вадаёмах. Так, герой рамана Л. Дайнекі «След ваўкалака» нават гатовы ўвекавечыць вобраз вадзяніка: «— У рацэ Менцы, каля якой я жыў, не было вадзянікоў, — уздыхнуў Белавалод. — І ў Свіслачы не было. Напэўна, у нас халаднейшая вада. Каб я ўбачыў вадзяніка, я выкаваў бы яго з жалеза або медзі» [6, с. 541]. Шкадаванне ў душы героя, які, дарэчы, жыве ў далёкім мінулым, сугучна думкам сучаснага чытача, занепакоенага стратай першароднасці прыроды.

Акрамя вадзяніка, народнай фантазіяй створаны іншыя не менш каларытныя персанажы. Продкі славян верылі, што жонкай вадзяніка з'яўляецца русалка, вобраз якой увасоблены ў шматлікіх мастацкіх творах (Я. Чачот, А. Міцкевіч, Я. Баршчэўскі, Я. Купала, М. Чарот, М. Багдановіч, У. Дубоўка, К. Буйло, А. Кажадуб і інш.). Гэтае павер'е адлюстравана, напрыклад, у вершы Я. Купалы «Русалка»: «Ў ціне, як бледны месяц засвеціцца, // Будзе русалка плаваць, круціцца; // К ёй вадзянік там зблíжыцца сватацца, // Выйдзе і сядзе з ёй над крыніцай. // Пойдзе гульня у іх мёдам салодзенькім, // Развесяляцца, чары завесяць; // Вецер, лясун, русалка з вадзянікам, // Пушча, крыніца, ночка і месяц» [7, с. 126]. Здрада каханага або ўласная смерць у раннім узросце вызначаюць тыпалагічныя рысы вобраза русалкі. Як і ў фальклорных крыніцах, у вершы М. Чарота «Русалка» прыгажосць аднайменнай гераіні спакушае маладых мужчын: «Прыгожы, гібкі стан, а вочы, нібы зоркі // А валасы — нібы травы шаўковай пук…» [8, с. 38].

У аднайменнай аповесці А. Кажадуба русалка нагадвае сучасную дзяўчыну, разняволеную, крыху прагматычную. Сваіх благіх намераў яна нават не ўтойвае ад хлопца: «Хочаш каго-небудзь утаплю? — кажа русалка» [9, с. 75]; або «Зараз пацалую цябе — і памром» [9, с. 75].

**Заключэнне.** Міфатворчасць беларускіх пісьменнікаў грунтуецца на фальклорных крыніцах, аднак не вычэрпваецца толькі імі. Захоўваючы тыпалагічную сутнасць вобразаў вадзяніка, русалкі, аўтары ствараюць уласны мастацкі свет, абумоўлены як індывідуальным стылем, так і гістарычнай эпохай. Міфалагічныя персанажы надаюць творам рысы фальклорнай стылізацыі і выяўляюць ідэю залежнасці чалавека ад таямнічых сіл прыроды, характэрную для язычніцкіх вераванняў. У сучаснай літаратуры раскрыццё вобразаў вадзяніка і русалкі звязваецца перш за ўсё з экалагічнымі матывамі.

**Спіс цытуемых крыніц**


1. Беларуская міфалогія : энцыклапед. слоўн. / С. Санько [і інш.]. — Мінск : Беларусь, 2004. — 592 с.
2. *Баршчэўскі, Я.* Выбраныя творы / Я. Баршчэўскі. — Мінск : Беларус. кнігазбор, 1998. — 480 с.
3. *Багдановіч, М.* Выбраныя творы / М. Багдановіч. — Мінск : Беларус. кнігазбор, 1996. — 494 с.
4. *Караткевіч, У.* Збор твораў : у 8 т. / У. Караткевіч. — Мінск : Маст. літ., 1987—1990. — Т. 2 : Аповесці, апавяданні, казкі. — 1988. — 511 с.
5. *Караткевіч, У.* Зямля пад белымі крыламі : нарыс. Дзікае паляванне караля Стаха : аповесць : для сярэд. і ст. школ. узросту / У. Караткевіч. — Мінск : Юнацтва, 1995. — 368 с.
6. *Дайнека, Л.* Меч князя Вячкі. След ваўкалака : раманы : для ст. школ. узросту / Л. Дайнека. — Мінск : Юнацтва, 1993. — 606 с.
7. *Купала, Я.* Вершы / Я. Купала. — Мінск : Маст. літ., 1988. — 270 с.
8. *Чарот, М.* Выбранае : для сярэд. і ст. школ. узросту / прадм. і ўклад. У. Гніламёдава. — Мінск : Юнацтва, 1982. — 222 с.
9. *Кажадуб, А.* Русалка : аповесць / А. Кажадуб // Маладосць. — 2005. — № 6. — С. 53—78.


Рэпазіторый БарДУ